Прамыя алюзіі на «Фаўста» Ё. В. Гётэ прысутнічаюць пры апісанні кабінета Сатаны ў легендзе. У пякельных універсітэцкіх аўдыторыях таксама вывучаюць гэты твор, дзе «у скажоным выглядзе падаецца станоўчы вобраз Мефістофеля» [6]. Канцэпцыя «смерці і ўваскрашэння», цэнтральная ў Гётэ, распрацоўваецца і Караткевічам: Рогач пераўвасабляецца ў чалавека, Гервасій трапляе ў царства смерці і зноў вяртаецца на зямлю (рай) разам з каханай.

Як і многія літаратары дваццатага стагоддзя, Уладзімір Караткевіч таксама спрычыніўся сваёй творчасцю да тэматыкі фаўсціяны, стварыўшы свае самабытныя і непаўторныя інтэрпрэтацыі.

## Літаратура


1. Гётэ, Ё. В. Выбраныя творы / Ё. В. Гётэ ; уклад., прадм. Л. Баршчэўскага і П. Капанёва ; камент. Л. Баршчэўскага і В. Сёмухі — Мінск, 1999.
2. Mickiewicz, A. Pani Twardowska [Электронны рэсурс] / A. Mickiewicz.— Рэжым доступу : http://literat.ug.edu.pl/xxx/amwiersz/0017.htm.
3. Міцкевіч, А. Дзяды : у 2 т. / А. Міцкевіч ; агул. рэд. І. Кур'ян ; пер. на бел. мову С. Мінскевіч ; камент. З. Стэфаноўска, С. Мінскевіч.— Т. 1.— Мінск, 1999.
4. Баршчэўскі, Я. Выбраныя творы / Я. Баршчэўскі ; уклад., прадм. і камент. М. Хаўстовіча.— Мінск, 1998.
5. Караткевіч, Ул. І наш Фаўст [Электронны рэсурс] / Ул. Караткевіч.— Рэжым доступу : http://uladzimir-karatkevich.com/arh/arh.html.
6. Караткевіч, Ул. Легенда аб бедным д'ябле і аб адвакатах Сатаны [Электронны рэсурс] / Ул. Караткевіч.— Рэжым доступу : http://uladzimir-karatkevich.com/arh/arh.html.



*Т. Ф. Сухоцкая*

Мінск, Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў


## Архетыпная аснова беларускай утопіі

Стварэнне вобраза будучыні, яе прагназаванне з'яўляюцца неабходнай умовай жыццядзеяння чалавека, уласцівасцю яго прыроды. Пошук шляхоў удасканалення сучаснасці звычайна рэалізуецца з дапамогай рацыянальных метадаў. Аднак не заўсёды яны здольныя выпрацаваць дасканалыя прагнастычныя праекты. Адной з формаў канструявання будучыні з'яўляецца ўтопія, якая прапаноўвае альтэрнатыўныя варыянты далейшага жыццядзе-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

яння соцыуму і чалавека. Менавіта на пачатку XXI стагоддзя, калі адбываецца змена парадыгмаў культуры, калі мы перажываем глабальныя сацыякультурныя зрухі, вялікія мабілізацыйныя магчымасці ўтапічнага мыслення і яго сіла ўздзеяння на людзей павінны быць улічаныя не толькі ў навуковай прагностыцы, але і ў дзейнасці дзяржаўных структур.

Актуальнасць утапічнага мыслення асабліва ўзрастае на сучасным этапе, калі Рэспубліка Беларусь актыўна ўключаецца ў інтэграцыйныя працэсы. Актывізуецца культурнае ўзаемадзеянне і ўзаемаўплыў паміж дзяржавамі, нацыянальнымі культурамі, у выніку якога фарміруецца адзіная агульначалавечая сістэма каштоўнасцей. Узгадненне розных нацыянальных форм культур садзейнічае іх аб'яднанню ў адзіную культурную сістэму. У гэтым ракурсе неабходна падкрэсліць інтэграцыйны патэнцыял нацыянальнай утопіі, скіраваны на тварэнне рэальнай культурнай прасторы ў адпаведнасці з прынцыпамі талерантнасці, здольнасцю да творчага пераасэнсавання дасягненняў іншых культур, адказнасцю за існуючы лад рэчаў.

У тэорыі ўтопіі ў XX ст. склаліся два асноўныя напрамкі: утопія разглядаецца як тып мыслення (К. Мангейм, Э. Блох, Е. Шацкі, А. Свентахоўскі, М. Вебер), пэўныя адносіны да жыцця, выражаныя ў форме тэксту, і як жанравая форма мастацкай літаратуры (Н. Фрай, М. Хілегас, Б. Ланін, Ч. Уэлш, А. Мортан, Л. Хабібуліна і інш.). Культуралогія зыходзіць з інтэграванага падыходу да вывучэння ўтопіі і вызначае яе як ідэальную канструкцыю, змест якой складае інтэнцыя да ўдасканалення грамадства ў адпаведнасці з пэўнай сістэмай каштоўнасцей.

У вывучэнні ўтопіі з пазіцый псіхааналітычнага падыходу можна вылучыць два тыпы даследчых методык: фрэйдаўскі і юнгіянскі. Па фрэйдаўскім тыпе ўтопія даследуецца як праяўленне чалавечага "бессвядомага" (работы Г. Батыгіна, Б. Кука, Д. Блейчыка і інш.). Юнгіянскі падыход разглядае ўтопію як секулярную рэканструкцыю сакральных архетыпаў, якія адлюстраваны ў тэксце (Х. Гюнтэр, Ю. Латыніна, Н. Фрай, М. Эліядэ і інш.).

У якасці правобраза і зыходнага матэрыялу для ўтопіі з'яўляецца міф, структурнымі элементамі якога выступаюць архетыпы. Менавіта з гэтых "элементарных блокаў" падсвядомае творыць свае вобразы і фарміруе міфасюжэты. Як бачым, міф з'яўляецца крыніцай ідэй, вобразаў для ўтопіі. З аднаго боку, утопія рацыяналізуе

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

міф, аднак ірацыянальнае захоўваецца ў ёй у выглядзе розных міфалагічных матываў і сюжэтаў, інакш, архетыпаў. Архетып, па К. Юнгу, "упарадкоўвае і звязвае сэнс у пачуццёвыя і ўнутраныя духоўныя ўспрыняцці. Ён замацоўвае энергіі, вызваленыя праз успрыняцце раздражненняў, да вызначанага сэнсу, які і скіроўвае дзеянні на шлях, які адпавядае дадзенаму сэнсу" [1, с. 542].

Архетыпы выклікаюць да жыцця комплексы ўяўленняў, якія выступаюць у выглядзе міфалагічных матываў. Менавіта вобразы міфалогіі і іншыя раннія формы культуры дапамагаюць нам вылушчыць сэнс архетыпаў. Рэканструіруючы міф ва ўтопіі, мы аднаўляем і расшыфроўваем зыходныя архетыпы. У міфе і ўтопіі прысутнічаюць адныя і тыя ж архетыпныя структуры — востраў, гара, герой і г.д. "Шчаслівыя астравы", "ледзянцовая гара" народжаныя народнай свядомасцю, але іх можна супаставіць і з літаратурнымі ўзорамі: сонечныя астравы Ямбула, востраў Утопія, Город Сонца і г.д.

Узровень жыццядзеяння чалавецтва як суб'екта гуманістычнай культуры шмат у чым залежыць ад характару і паўнаты спасціжэння сутнасці быцця, яго каштоўнасці. "Замілаванне да жыцця" — менавіта гэтую духоўную каштоўнасць А. Швейцар ацэньваў як выратоўны сродак у сітуацыі татальнага крызісу культуры [2]. Замілаванне да жыцця стала лейтматывам беларускай утопі, што раскрывае не толькі яе нацыянальную, але і агульначалавечую значымасць. Сувязь ідэалу з рэальным сацыякультурным вопытам у беларускай культуры, бадай, найбольш арганічная і жыццёвая.

Утопія — гэта своеасаблівы тэкст культуры, у якім адлюстроўваецца светаўспрыманне, светаразуменне народа, ягоная ментальнасць. Характэрнай рысай нацыянальнага менталітэту з'яўляецца кансерватыўна-ахоўны тып утапічнага мыслення, арыентаваны на захаванне традыцыйных каштоўнасцей. Стабільнасць, размеранасць, непрыняцце без неабходнасці рэвалюцыянарысцкіх праяў, паэтызацыя зямлі, побыту, рэальнага чалавечага жыцця, суіснаванне ў гармоніі з прыродай — спецыфіка беларускай утопіі.

Эвалюцыя ўтапічных ідэй на Беларусі адбывалася ў сферы грамадска-палітычнай і філасофскай думкі. Толькі недзе пачынаючы з XIX ст. элементы ўтопіі атрымалі распаўсюджванне ў мастацкай літаратуры, дзе знайшлі найбольш поўнае адлюстраванне ў такіх жанравых формах, як ідылія, "казкі жыцця", творы з афіцыйнай утопіяй, антыўтопія.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

У беларускай культуры не склалася жорстка ўнармаваная форма ўтопіі. Для яе ўласцівыя больш пастэльныя адценні. Першае слова прапанаванага Я. Коласам азначэння беларускай утопіі — "казка жыцця" — паказвае на ўнутраную, арганічную сэнсавую яе сувязь з народнай казкай. У змест арыгінальных "Казак жыцця" (1921 г.) пісьменнікам закладзеная маральна-этычная і эстэтычная праблематыка, ад вырашэння якой залежыць будучыня. І. Навуменка асэнсоўвае Коласавы казкі як "эцюды аб еднасці, знітаванасці чалавечых пачуццяў, адчуванняў з праявамі навакольнай прыроды" [3, с. 286]. Ім уласцівы ўстойлівы комплекс архетыпных вобразаў і сімвалаў: жывая вада і мёртвае поле, адзінокае Дрэва, Дуб, Жолуд. Дуб з'яўляецца ўвасабленнем мудрасці, магутнасці, вечнасці, матыль — лёгкадумнасці, крумкач — вястун змрочна-трагічнага, свіння — носьбіт непераборлівасці. Я. Колас стварае ідылічны, сапраўды казачны свет прыроднай гармоніі, які адначасова з'яўляецца комплексам нявырашаных праблем беларускага сацыяльнага жыцця-быцця. Утапічны ідэал адзінства творчых сіл прыроды і чалавека на зямлі ён бачыў у развіцці і ўдасканаленні форм існавання.

У "Новай зямлі" Якуба Коласа хараство і разнастайнасць "тутасці", тут-быцця раскрываецца праз архетып Зямлі. Праз яе эстэтызацыю і сакралізацыю была сцверджана магчымасць адраджэння паэтычнай інтэрпрэтацыі быцця, пераадолення бездухоўнага існавання. Утапічны ідэал беларуса-селяніна ўвасабляецца ў мары пра магчымасць свабоднай працы на сваёй зямлі, у імкненні перастварыць яе ў "казку жыцця".

Культы сонца, зямлі, вады сталі духоўным рэсурсам аднаго з найбольш значных архетыпных вобразаў у беларускай культуры — нівы, семантыка якой і ў ХХ стагоддзі была надзвычай дзейснай сацыяльнай і духоўнай сілай у адраджэнцкім руху.

Я. Колас падводзіць нас да высновы, што ўтапічны ідэал — "казка жыцця" — можа быць дасягнуты, бо само жыццё і ёсць казка. На фоне відавочнага крызісу рэнесансна-індывідуалістычных поглядаў на сутнасць асобы чалавека і абсалютызацыі дысгармоніі ў адносінах чалавека і соцыуму ў развітых літаратурах Еўропы, творы Я. Коласа ў беларускай літаратуры адкрываюць новыя глыбіні і высі духоўнай повязі чалавека з Сусветам. Не менш важнае значэнне мае раскрыццё духоўнага багацця народа, яго ролі ў захаванні архетыпнай асновы нацыянальнага менталітэту.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Адной з галоўных ва ўтапічных творах з’яўляецца сімволіка дома і антыдома. Архетып дома з’яўляецца выражэннем бінарнай апазіцыі “космас — хаос”. Звычайна яго семантыка зводзіцца да разумення закрытай унутранай прасторы, якая знаходзіцца ў апазіцыі да знешняга свету. Прастора дома дае прытулак і абараняе ад знешняга зла, тут сканцэнтраваныя ўніверсальныя жыццёвыя каштоўнасці — шчасце, любоў, згода, дабрабыт. Звычайна дом выступае сімвалам еднасці сям’і, рода, таму што пераходзіць ад бацькоў да дзяцей. Важнейшай функцыяй архетыпу дом з’яўляецца абарончая. У аксіялагічным плане архетып дома быў і застаецца першас- най каштоўнасцю ў нацыянальнай утопіі беларусаў. У “Новай зям- лі” Якуба Коласа запаветнай марай для Міхася і Антося становіцца жаданне мець свой дом, а не часовы прытулак для сям’і. Прастора дома ўспрымаецца як абарона памяці продкаў, родавай духоўнасці, намоленай перад сямейным іканастасам. Разбурэнне традыцыйнай семантыкі дома адбываецца з боку стыхійных сіл, з якімі чалавек не можа справіцца (перасяленне сям’і Міхала ў “Новай зямлі” Якуба Коласа, руйнаванне дома Зяблікаў у “Раскіданым гняздзе” Янкі Купалы, высяленне сем’яў у Сібір у “Знаку бяды” Васіля Быкава і г.д.):

Ў другі куток перабірацца…
Рабі, працуй, кладзі ты сілы
У гэты дол чужы, пастылы
І горкім потам аблівайся;
Зрабіў парадак — выбірайся
Ды зноў ідзі адсюль у госці…[4, с. 31].

Здабыткам беларускай культуры з’яўляецца арыгінальны архетыпны вобраз культурнага героя, які выступае ў ролі рэгулятара каштоўнаснай сістэмы і мадэлі паводзін, з’яўляецца сімвалам нацыянальнай ідэнтычнасці. Сімвалічныя функцыі і роля дадзенага архетыпу ў розныя перыяды вызначаюцца сацыякультурным кантэкстам, што вядзе да фарміравання новай семантыкі, а гэта змяняе культурную прастору. У масавай свядомасці нашага часу дадзеная міфалагема часта замяняецца рэальнымі прадстаўнікамі маскультуры, што можа прывесці да ўзнікнення новай субкультуры.

У беларускай культуры архетып культурнага героя існуе ў розных раслінных, заамарфных і антрапаморфных мадыфікацыях. Найбольш сэнсаёмкім з’яўляецца архетыпны вобраз гаспадара.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Гаспадарская парадыгма была вызначальнай і дзейснай на розных этапах развіцця нацыянальнай культуры. Галоўным культурным героем народнага эпасу і каляндарнай паэзіі з'яўляецца дбайны, адказны гаспадар, у якім спалучаюцца якасці сейбіта і воіна. Дадзеная парадыгма вызначыла змест каштоўнасных прыярытэтаў у часы станаўлення беларускага этнасу інацыі.

Як бачым, беларуская ўтопія — унікальны складнік агульнаеўрапейскай культуры. У XX–XXI стагоддзі яна стала формай глыбокага філасофскага спасціжэння сутнасці эпохі, сродкам фарміравання нацыянальнай самасвядомасці. Яна выяўляе рэальныя культурныя рэсурсы нацыі, асобы. Не дае рэцэптаў, а раскрывае вераемнасць "новай зямлі". Вызначальным для беларусаў становіцца кансерватыўны, ашчаджальны тып мыслення, несумяшчальны з нігілізмам, незалежна ад яго афарбоўкі. Кансерватызм для беларусаў — у асноўным, захаванне.

Актуалізацыя ўтапічнага мыслення, зварот да архетыпных асноў утопіі — гэта тэндэнцыя сучаснай дынамічнай эпохі глабалізацыі і інтэграцыі. Менавіта праз іх у час зменаў праяўляецца ўстойлівасць асноў нацыянальнага быцця, магчымасць будаваць упарадкаванае грамадства, фарміраваць сваю будучыню.

## Літаратура


1. Юнг, К. Психологические типы / К. Юнг.— М., 1996.
2. Швейцер, А. Культура и этика / А. Швейцер.— М., 1973.
3. Навуменка, І. Я. Якуб Колас: Нарыс жыцця і творчасці / І. Я. Навуменка.— Мінск, 1982.
4. Колас, Я. Новая зямля. Сымон-музыка : паэмы / Я. Колас.— Мінск, 1986.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*К. В. Тулупова*
Минск, Белорусский государственный университет

## Отражение немецкого и французского менталитета в сказках о Красной Шапочке братьев Гримм и Шарля Перро

Каждое литературное произведение принадлежит не только своему автору, но и эпохе, той или иной стране, народу. В нем, так или иначе, отражаются черты истории, культуры, языковые